## Білет 2

**Практычнае заданне.**
**Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якая мадэль развіцця была прынята ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 1990-х гг.?
2. Што сведчыць аб эфектыўнай рэалізацыі выбранай мадэлі развіцця? Свой адказ пацвердзіце цытатай.
3. Сфармулюйце 3 (тры) тэзісы аб магчымых наступствах (эканамічных, сацыяльных, экалагічных) увода ў эксплуатацыю БелАЭС.
4. Складзіце табліцу, адлюструйце ў ёй не менш трох прыкмет беларускай мадэлі эканамічнага развіцця і іх праяўленні.

**І. . Распрацоўка беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, мэты і сродкі яе рэалізацыі.** *(па матэрыялах навучальнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі.1917 г. - пачатак XXI ст. 9 клас»).*

У праграме дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь, прынятай у 1997 г., адзначалася: «У якасці нацыянальнай мадэлі развіцця Рэспублікі Беларусь вызначана сацыяльна арыентаваная рынечная эканоміка, якая заклікана спалучаць… перавагі рыначнай канкурэнцыі і эфектыўнай сістэмы сацыяльнай абароны, ідэі рыначнага самарэгулявання і дзяржаўнага кіравання».

Сацыяльна арыентаваная эканоміка ўяўляе сабой мадэль эканамічнага развіцця, пры якой суіснуюць дзяржаўны і прыватны сектары эканомікі, а дзяржава адыгрывае вызначальную ролю ў рэгуляванні эканамічных працэсаў і фарміраванні ўмоў для забеспячэння патрэбнасцей насельніцтва.

Для рэалізацыі гэтай стратэгіі выкарыстоўвалася сістэма вызначэння дзяржавай планавых сацыяльна-эканамічных паказчыкаў і рэгулявання цэн. Пяцігадовыя праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, пачынаючы з 1996 года, прымаліся на Усебеларускім народным сходзе.

Стаўка была зроблена на захаванне буйных прамысловых прадпрыемстваў і калгасаў, якія дзейнічалі з часоў СССР, і іх дзяржаўнае фінансаванне. Пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі паслядоўна рэалізоўвалася палітыка, накіраваная на паляпшэнне дабрабыту народа.

Па версіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Рэспубліка Беларусь у 2018 г. заняла 53-е месца сярод 189 краін свету па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу (ахова здароўя і стан здароўя, стан адукацыі і ўзровень пісьменнасці) і ўвайшла ў групу краін з высокім узроўнем развіцця.

**ІІ. Прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь**

| Перыяды развіцця Рэспублікі Беларусь | Прыярытэты развіцця |
|---|---|
| 1996–2000 гг. | Экспарт тавараў і паслуг, будаўніцтва жылля, забеспячэнне людзей прадуктамі харчавання |

| | |
|---|---|
| 2001–2005 гг. | Паляпшэнне дабрабыту народа, прыбліжэнне ўзроўня яго жыцця да ўзроўня жыцця насельніцтва эканамічна развітых еўрапейскіх дзяржаў |
| 2006–2010 гг. | Далейшы рост якасці жыцця насельніцтва, праграмма адраджэння і развіцця вёскі, будаўніцтва аграгарадкоў |
| 2011–2015 гг. | Рост дабрабыту і паляпшэнне ўмоў жыцця насельніцтва на падставе павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі, развіццё прадпрымальніцкай ініцыятывы |
| 2016–2020 гг. | Развіццё чалавечага патэнцыялу, павышэнне дабрабыту, рост нараджальнасці, павелічэнне працягласці жыцця, забеспячэнне якасці аховы здароўя і адукацыі |
| 2021–2025 гг. | Шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна, дзяржава-партнер |

**III. Аб энергетычнай бяспецы Беларусі** *(па матэрыялах “СБ. Беларусь сегодня”)*

Доступам да электраэнергіі забяспечана 100 працэнтаў насельніцтва Беларусі. Яе вытворчасць забяспечваецца на ўласных электрастанцыях. Пры гэтым Беларусь займае 4-е месца ў рэйтынгу краін Еўропы з самай таннай электраэнергіяй для насельніцтва.

Знакавай падзеяй для Беларусі стала ўвядзенне ў прамысловую эксплуатацыю ў 2021 годзе першага энергаблока БелАЭС. З моманту ўключэння першага блока БелАЭС у аб'яднаную энергасістэму выпрацавана 9,3 млрд. кВтг электраэнергіі, што дало магчымасць замясціць 2,4 млрд. куб.м прыроднага газу. З уводам у прамысловую эксплуатацыю другога энергаблока агульны аб'ём выпрацоўкі электраэнергіі на БелАЭС складзе больш за 18 млрд. кВт.гадз.

БелАЭС дазволіць замяніць 25% усяго газу, які спажываецца ў рэспубліцы. За кошт уводу станцыі выкіды вуглякіслага газу будуць скарачацца больш як на 7 млн тон у год.

З запускам атамнай электрастанцыі адкрываюцца добрыя магчымасці для развіцця ў Беларусі зараднай інфраструктуры. Яшчэ адзін перспектыўны напрамак – выкарыстанне электраэнергіі для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння. За 9 месяцаў 2021 года спажыванне насельніцтвам электраэнергіі на названыя мэты вырасла ў 3,6 разы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.